МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

# ПАСТАНОВА

# ПОСТАНОВЛЕНИЕ

22.08.2023 № 114

г. Мінск

г. Минск

Аб наданні статусу і катэгоры
гісторыка-культурнай каштоўнасці

На падставе часткі першай пункта 1 артыкула 93, пункта 4 артыкула 96, часткі першай пункта 6 артыкула 97 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры, абзацаў другога і трэцяга падпункта 5.13 і падпункта 5.14 пункта 5 Палажэння аб Міністэрстве культуры, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 17 студзеня 2017 г. № 40, рашэння Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь ад 11 жніўня 2023 г. № 04-01-02/6, Міністэрства культуры ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Надаць статус гісторыка-культурнай каштоўнасці і катэгорыю ”А“ нематэрыяльнаму праяўленню творчасці чалавека ”Традыцыйнае інструментальнае выкананне на дыятанічных цымбалах“ у г. Паставы, агаргарадку Варапаева, в. Гута, аграгарадку Дунілавічы Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці.

2. Раздзел 3 ”Нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці Рэспублікі Беларусь“ Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, зацверджанага пастановай Міністэрства культуры ад 3 студзеня 2023 г. № 1, пасля пазіцыі

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | **”Пастаўскі раён** | | | |
| 23БЛ000120 | Народная гульня моладзі ”Яшчар“ | - | в. Гута | Б | рашэнне Рады 28.04.2018 № 04-01-02/4 | пастанова Міністэрства культуры 10.05.2018 № 31“ |

дапоўніць пазіцыяй

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| ”23АК000176 | Традыцыйнае інструментальнае выкананне на дыятанічных цымбалах | – | г. Паставы, агаргарадок Варапаева, в. Гута, аграгарадок Дунілавічы Пастаўскага раёна | А | рашэнне Рады 11.08.2023 № 04-01-02/6 | пастанова Міністэрства культуры 22.08.2023 № 114“. |

3. Гэта пастанова ўступае ў сілу пасля яе падпісання.

Першы намеснік Міністра В.І.Грамада

Зак. 518.